**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ЗБОР ДАКУМЕНТАЎ ДЗЕЯЧАЎ ЛІТАРАТУРЫ

**1965–2019**

**ФОНД № 55**

**ВОПІС № 3**

**[1916]–2011, коп. за 1910-2001 гг.**

**МІНСК 2024**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 3** **ф. 55**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ФАТАГРАФІЯ М. АРЛА (С.Я. ПЯЦЕЛЬСКАГА) | 1 | 1 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАГВІНОВІЧА | 2-31 | 1-5 |
| 2.1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАГВІНОВІЧА | 2-15 | 1-2 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ ДА І.П. ЛАГВІНОВІЧА | 16-20 | 2-3 |
| 2.3. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАГВІНОВІЧА, ДАКУМЕНТЫ ПРА ЯГО І ІНШ. | 21-24 | 3-4 |
| 2.4. | ВЕРШЫ ІНШЫХ АЎТАРАЎ, САБРАНЫЯ І.П. ЛАГВІНОВІЧАМ, І ІНШ. | 25-27 | 4 |
| 2.5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАГВІНОВІЧА | 28-31 | 4-5 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ Л.Я. ПРОКШЫ | 32-41 | 5-6 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ К.М. ЯКАЎЧЫКА | 42-49 | 6-7 |

## Прадмова

У выніку навукова-тэхнічнага апісання быў складзены вопіс № 3 у колькасці 49 спраў (486 дакументаў) за [1916]–2011, коп. за 1910-2001 гады, якія паступілі ў БДАМЛМ у 1965–2019 гадах. Вопіс складаецца з 4 раздзелаў, сістэматызаваных па алфавіце прозвішчаў фондаўтваральнікаў, унутры раздзелаў – адпаведна прынятай у БДАМЛМ схемы.

Першы раздзел прадстаўлены фатаграфіяй паэта, публіцыста, перакладчыка, фалькларыста **М. Арла** (сапраўднае імя **Пяцельскі Сцяпан Язэпавіч,** крыптанім **М.А.**). М. Арол нарадзіўся каля 1890 года ў мястэчку Гарадок Беластоцкага павета Гродзенскай губерні, дзе скончыў пачатковую школу. Пасля заканчэння ў 1909 годзе царкоўна-настаўніцкай школы ў вёсцы Ялоўка Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні (цяпер – Беластоцкі павет Падляскага ваяводства Польшчы) выкладаў у Ялоўцы і Гарадку, вёсцы Струга (1910–1912) і мястэчку Парэчча на Гродзеншчыне. У 1913–1914 гадах жыў на Ковеншчыне. На пачатку Першай Сусветнай вайны быў мабілізаваны ў царскую армію, за мужнасць і баявыя заслугі ўзнагароджаны Георгіеўскім крыжом. У верасні 1917 года знаходзіўся са сваёй вайсковай часткай ва Украіне, дзе захварэў тыфам і памёр у канцы 1917 ці ў 1918 годзе.

Дэбютаваў у 1909 годзе вершам у газеце “Наша ніва”. Друкаваўся ў “Беларускім календары”, часопісе “Лучынка” і інш. Падрыхтаваў да друку зборнік паэзіі “Лірнік” (не быў надрукаваны).

Прадстаўленая ў фондзе фатаграфія М. Арла [1916 года] – адзіная вядомая беларускай літаратурнай іканаграфіі. У 2019 годзе пры пасярэдніцтве пісьменніка, літаратуразнаўцы і бібліяфіла Міхася Казлоўскага яна была набыта БДАМЛМ на аўкцыёне AY-BY.

Другі раздзел складаюць дакументы **Лагвіновіча Івана Піліпавіча** (псеўданімы **– Апалінар Абадоўскі**, **Ян Дзівасіл** і інш.) – паэта. І.П. Лагвіновіч нарадзіўся 16 студзеня 1940 года на хутары Запрапасць (паблізу вёскі Малькавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці). У 1957 годзе паехаў на Данбас, у 1959 годзе скончыў Горнапрамысловае вучылішча № 10 Новага Данбаса (цяпер – горад Сніжнэ), у 1966 годзе – сярэднюю школу рабочай моладзі № 1 Тарэза (цяпер – горад Чысцякова), у 1982 годзе – Данецкі абласны ўніверсітэт рабселькораў. Адначасова працаваў на шахце. У 1977 годзе з-за прафесійнага захворвання перавёўся слесарам на Цэнтральную збагачальную фабрыку “Данецкая” вытворчага аб’яднання “Торезантрацит”. У 1990 годзе выйшаў на пенсію, у 1991 годзе вярнуўся ў Беларусь, жыў у Паставах, з траўня 1992 года – у Баранавічах. І.П. Лагвіновіч памёр 31 сакавіка 2011 года, пахаваны ў вёсцы Малькавічы.

Дэбютаваў у 1960 годзе вершамі ў газеце “Чырвоная змена”. Аўтар кніг паэзіі “Разлукі выраёвыя” (2000), “Піліпаўка” (2001), “Ляда юдолі” (2003), “Далёкае і блізкае” (2004), “Палыновыя кветкі” (2007) і інш.; артыкулаў і нататак для газеты “Горняк” (Украіна); гумарэсак для часопіса “Вожык” і інш. З 2003 года – член Саюза беларускіх пісьменнікаў, у 2008 годзе – лаўрэат

абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка за кнігу паэзіі “Палыновыя кветкі”.

Дакументы І.П. Лагвіновіча паступілі ў БДАМЛМ ад яго ўнучкі Наталлі Іванаўны Занько ў 2011 годзе. Яны прадстаўлены пяці раздзелах: творчыя дакументы І.П. Лагвіновіча (справы сістэматызаваны па жанрах, затым – па храналогіі, у межах адной справы – па алфавіце назваў твораў); пісьмы да І.П. Лагвіновіча (справы сістэматызаваны па алфавіце краін, а ўнутры справы – па алфавіце карэспандэнтаў, ад аднаго карэспандэнта – па храналогіі); асабістыя дакументы І.П. Лагвіновіча, дакументы пра яго і інш. (справы сістэматызаваны на намінальна-храналагічным прынцыпе); вершы іншых аўтараў, сабраныя І.П. Лагвіновічам (справы сістэматызаваны па храналогіі, унутры адной справы – па алфавіце аўтараў), і выяўленчыя дакументы (справы сістэматызаваны па відах дакументаў) за 1959–2011, коп. за 1910–2001 гг.

Трэці раздзел прадстаўлены дакументамі **Прокшы Леаніда Януаравіча** (псеўданімы – **Верашчака Л.**, **Кудла Л.**, **Кудла Лявон**, **Леанідаў П.**) – пісьменніка, журналіста. Л.Я. Прокша нарадзіўся 6 (19) красавіка 1912 года ў Полацку. У 1931 годзе скончыў Мінскі педагагічны тэхнікум (цяпер – Мінскі гарадскі педагагічны каледж). У 1931–1935 гадах працаваў настаўнікам у Барысаве, у 1937–1941 гадах – у рэдакцыях газет “Віцебскі рабочы”, “Pionier”, “Sztandar Wolności”. У гады Другой Сусветнай вайны працаваў ваенным журналістам, у 1945–1956 гадах – загадчыкам аддзела ў армейскай газеце. У 1955 годзе скончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І. Леніна ў Маскве. У 1956–1972 гадах працаваў рэдактарам газеты “Голас Радзімы” і галоўным рэдактарам часопіса “Коммунист Белоруссии” (цяпер – часопіс “Беларуская думка”), у 1969–1972 гадах – галоўным рэдактарам часопіса “Літаратура і мастацтва”. Л.Я. Прокша памёр 9 снежня 1994 года.

Пачаў друкавацца ў 1937 годзе. Аўтар зборніка “Источник красоты: рассказы и очерки” (1960), кнігі памфлетаў “Камедыянты” (1961), зборніка гумарыстычных апавяданняў “Каб жылося-вялося” (1961), “Не ў гэтым поездзе” (1971), “Зося смяецца” (1982); дакументальнай аповесці “За Добрыцай-ракой” (1975), рамана “Пакуль жывеш на свеце” (1980) і інш. З 1961 года – член Саюза пісьменнікаў БССР.

Дакументы Л.Я. Прокшы паступілі ў БДАМЛМ у 1965 годзе ад самога фондаўтваральніка. Пераважна гэта – фатаграфіі Л.Я. Прокшы, індывідуальная і ў групах з іншымі людзьмі. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за [1930-я] – 1983 гады.

Чацвёрты раздзел складаюць дакументы **Якаўчыка Кліменція Марцінавіча** (псеўданімы – **Т. Бов, К. Кундзіш**, крыптанім **К.М.**) – літаратуразнаўцы, перакладчыка. К.М. Якаўчык нарадзіўся 7 лістапада 1898 года ў вёсцы Дольная Свіслач Гродзенскага павета Гродзенскай губерні (цяпер – вёска Свіслач Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці). Скончыў Свіслацкае двухкласнае вучылішча, вучыўся у Нова-Вілейскай настаўніцкай семінарыі (разам з У. Дубоўкам). Пасля яе заканчэння ў 1918 годзе паехаў да братоў у

Маскву, дзе скончыў Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя В.Я. Брусава (першы выпуск). Пасля заканчэння інстытута, у 1920-я – 1930-я гады, працаваў рэдактарам у Маскоўскім дзяржаўным выдавецтве. У чэрвені 1941 года дабраахвотнікам пайшоў на фронт, загінуў без весткі ў снежні 1941 года.

Друкаваўся ў перыядычных выданнях Масквы і Ленінграда. Адным з першых пачаў перакладаць беларускую літаратуру на рускую мову. У 1929–1935 гадах пераклаў: раман Змітрака Бядулі “Язеп Крушинский”, аповесць Якуба Коласа “В глуши Полесья”, зборнік апавяданняў Янкі Нёманскага “На изломе”, аповесць “Переполох на межах” і раман “Сквозь годы” Платона Галавача і інш. Пісаў літаратуразнаўчыя артыкулы. Імя К.М. Якаўчыка змешчана на мемарыяльнай дошцы ў маскоўскім Доме літаратараў.

Дакументы К.М. Якаўчыка паступілі ў БДАМЛМ у кастрычніку 1982 года ад яго ўдавы Наталлі Сяргееўны Бярозка. Гэта літаратуразнаўчыя артыкулы К.М. Якаўчыка, яго пераклады, асабістыя дакументы К.М. Якаўчыка, дакументы пра яго і інш., складзеныя па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1923–1983, коп. за 1921–1938 гады.

Прадмову склала В.Ф. Шаталава
Заг. аддзела
18.03.2024

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 55
ВОПІС № 3
[1916]–2011, коп. за 1910-2001 гг.

ЗАЦВЕРДЖАНА

ПРАТАКОЛ ЭМК БДАМЛМ
ад
№ 3

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ФАТАГРАФІЯ М. АРЛА (С.Я. ПЯЦЕЛЬСКАГА)** | | | | |
| 1 | Фота М. Арла (С.Я. Пяцельскага) у вайсковай форме, з Георгіеўскім крыжом.<br>На адваротным баку надпіс: "Действующая армия. 5 батарея. 16 артил. бригада. Ст. Петельский" | [1916] | 2 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАГВІНОВІЧА** | | | | |
| | **2.1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАГВІНОВІЧА** | | | | |
| | Вершы на беларускай мове | | | | |
| 2 | І.П. Лагвіновіч "Малітва беларуса", "Мама-матуля-маці" і інш. Вершы і нататкі за 1960-1999 гг.<br>Сшытак з аўтографам | | 83 | 1 | |
| 3 | І.П. Лагвіновіч (Ян Дзівасіл, Ян Лагвіновіч) "Адзінота", "Акрасанэт", "Безназоўная зорка", "Вершы для спагаднай жанчыны" і інш. Вершы.<br>Выразкі і ксеракопіі газетных публікацый, часопіс "Дыялог" (№ 4, 2003) і газета "Царква" (№ 2, 2009) | 1961-2007 | 76 | 50/140 | |
| 4 | І.П. Лагвіновіч "Жнівень", "За аселіцай" і інш. Вершы і нататкі за 1963-2001 гг.<br>Сшытак з аўтографам | | 62 | 1 | |
| 5 | І.П. Лагвіновіч "Абяцае язьмінавы вечар…", "Адрынуты", "Бледнарусь" (варыянты тэксту), "Быць паэтам сьмець…" (варыянты тэксту), "Васількі й валошкі" і інш. Вершы і паэма.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс | 1987-2011 | 121 | 88/181 | |
| 6 | І.П. Лагвіновіч. "Піліпаўка". Зборнік вершаў без вокладкі.<br>Арыгінал-макет | 2001 | 13 | 1 | |
| 7 | І.П. Лагвіновіч. "Ляда юдолі". Зборнік вершаў. Няпоўны тэкст.<br>Арыгінал-макет | 2003 | 31 | 1 | |
| 8 | І.П. Лагвіновіч. "Палыновыя кветкі: вершатворы". | 2007 | 78 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Вершы да мяркуемага зборніка.<br>Кампутарны выдрук з аўтарскай праўкай | | | | |
| | Вершы на рускай мове | | | | |
| 9 | И.Ф. Логвинович "Алеся", "Баллада о двух глотках воды", "Без надежды не оставь", "Бессонница земли", "В предчувствии снега" і інш. Вершы.<br>Выразкі з газет | [1960-я гг.] - 2002 | 66 | 66/84 | |
| 10 | И.Ф. Логвинович. "Исповедь". Вершы да мяркуемага зборніка за 1962-1990 гг.<br>Сшытак з аўтографам | | 40 | 1 | |
| 11 | И.Ф. Логвинович "А вы не зря наверно выбрали…", "В январе перелётные птицы…" і інш. Вершы.<br>Аўтограф | [1970-я - 2000-я гг.] | 23 | 22 | |
| 12 | И.Ф. Логвинович. "Чарующий свет красоты". Вершы і паэма да мяркуемага зборніка.<br>Сшытак з аўтографам | [ад 1984 г.] | 20 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 13 | И.Ф. Логвинович "Буду с вами", "Быть там, где нужнее всего", "В подшефном колхозе" і інш. Артыкулы і нататкі (на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах).<br>Выразкі з газет | 1960-2000 | 28 | 28 | |
| | *** | | | | |
| 14 | І.П. Лагвіновіч (Апалінар Абадоўскі, Ян Дзівасіл і інш.) "Во праблема!", "Выбліскі", "Гумарынкі", "Дапытаўся-такі" і інш. Гумарэскі для часопіса "Вожык" і інш.<br>Машынапіс, выразкі з газеты і часопіса | 1990-2001 | 27 | 27/43 | |
| | *** | | | | |
| 15 | И.П. Логвинович "Музе", "По тебе я загрустил", "Под сосною скопились…" і інш. Вершы ў перакладзе Ю. Мацюшкі з беларускай мовы на рускую.<br>Кампутарны выдрук | 2010 | 3 | 3/5 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ ДА І.П. ЛАГВІНОВІЧА** | | | | |
| | Беларусь | | | | |
| 16 | Паштоўка і пісьмы Л.М. Галубовіча (14) І.П. Лагвіновічу (Беларусь).<br>На Лл. 16-17 - пісьмо М.М. Маліноўскага да | 2001-2005 | 20 | 15 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Л.М. Галубовіча (2003) | | | | |
| 17 | Паштоўка і пісьмы ад Н.С. Гілевіча, А.К. Каско (2), М.С. Купрэева (2), Н.І. Мацяш, А.У. Свірыда і інш. да І.П. Лагвіновіча (Беларусь) | 2001-2010 | 14 | 8 | |
| | Украіна | | | | |
| 18 | Паштоўка і пісьмы ад У. Калеснікава з прыпіскай М.Ф. Сіткава, А.С. Кузьменкі (6) і інш. І.П. Лагвіновічу (Украіна). Канверт ад пісьма сям'і Іўлевых І.П. Лагвіновічу (Украіна) | 2000-2010 | 16 | 9 | |
| 19 | Пісьмы ад сына Расціслава, унучкі Ганны і інш. І.П. Лагвіновічу (Украіна) | 2001-2002 | 8 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 20 | Пісьмы рэдактара аддзела літаратуры часопіса "Полымя" і супрацоўнікаў Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя В.Ф. Праскурава І.П. Лагвіновічу з прапановай арганізаваць яго творчы вечар і інш. Віншавальныя паштоўкі ад супрацоўнікаў музея-сядзібы "Пружанскі палацык", старшыні ТБМ (Беларусь), рэдакцыі газеты "Горняк" (Украіна) І.П. Лагвіновічу | 1985-2010 | 6 | 5 | |
| | **2.3. АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.П. ЛАГВІНОВІЧА, ДАКУМЕНТЫ ПРА ЯГО І ІНШ.** | | | | |
| 21 | Асабістыя дакументы І.П. Лагвіновіча (атэстаты Горнапрамысловага вучылішча № 10 Новага Данбаса і СШ рабочай моладзі № 1 Тарэза, дыплом Данецкага абласнога ўніверсітэта рабселькораў (Украіна) і інш.). Арыгіналы і ксеракопіі | 1959-1987, коп. за 1999, 2000 | 16 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 22 | Артыкулы і нататкі, пра і са згадкай І.П. Лагвіновіча і яго кніг. Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай Л.М. Галубовіча, выразкі і ксеракопіі газетных публікацый | 1982-2010 | 22 | 18 | |
| 23 | Вершы А. Корнева і Р. Раманчук і вершы-пераклады М. Маліноўскага, прысвечаныя І.П. Лагвіновічу. На Л. 2 - віншаванні М. Маліноўскага І.П. Лагвіновічу з днём нараджэння (аўтограф) (2007). Аўтограф Р. Раманчука, машынапіс, кампутарны | 2007-2010 | 3 | 3/8 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | набор | | | | |
| 24 | Віншавальныя паштоўкі і пісьмо А. Галаскока, А. Корнева, М. Маліноўскага і інш. І.П. Лагвіновічу з юбілеем | 2010 | 7 | 6 | |
| | **2.4. ВЕРШЫ ІНШЫХ АЎТАРАЎ, САБРАНЫЯ І.П. ЛАГВІНОВІЧАМ, І ІНШ.** | | | | |
| 25 | Н.А. Арсеннева "У гушчарах", М.А. Багдановіч "Пагоня", К.А. Буйло "Люблю наш край!" і інш. Вершы і словы песень.<br>И. Бродский "Anno Domini", "Римские элегии", "Рождественский романс" і інш. Вершы.<br>Рукапісныя і машынапісныя копіі, зробленыя І.П. Лагвіновічам, выразка і ксеракопіі газетных публікацый | коп. за 1910-2001 | 35 | 10/45 | |
| 26 | Вершы сяброў І.П. Лагвіновіча па гарадской літаратурнай студыі імя М. Тарэза (Украіна) і інш. (на рускай і ўкраінскай мовах).<br>Сшытак з аўтографамі, машынапіс, выразкі з газет. На Лл. 1-2 - верш-зварот І.П. Лагвіновіча да сяброў па літаб'яднанню (аўтограф) і яго фота | [1970-я гг. - 1991] | 40 | 31/118 | |
| 27 | Вершы Р.І. Лагвіновіча (сына) "Слова, что сказаны…", "Старый скрипач", нататка са згадкай З.Г. Лагвіновіч [жонкі].<br>Артыкулы пра С. Пацехіна і Т.Р. Шаўчэнку і інш. Выразкі з газет, часопіс "Місіянерчык" (№ 1, 2001) | 1984-2001 | 12 | 5/6 | |
| | **2.5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 28 | Фатаграфіі [Р.І. Лагвіновіча (сына)], удзельнікаў Палонкаўскага фэста і інш.<br>Арыгіналы і копія | 2010, коп. за [1990-я гг.] | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 29 | Вокладкі кніг І.П. Лагвіновіча "Заряна", "Піліпаўка" [і інш.].<br>Ксеракопіі малюнкаў | 2001-2002 | 7 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 30 | Малюнкі[-ілюстрацыі] неўстаноўленых аўтараў.<br>Папера, змешаная тэхніка | [2000-я гг.] | 2 | 2 | |
| 31 | Абразы "Езу, давяраю Табе!", Прасвятой Багародзіцы, Св. Яна Паўла II, каляндарык з малюнкам А. Басалыгі "Малітва".<br>Паштоўкі з выявамі М.А. Багдановіча і гурта "Ulis" | 1991-2009 | 9 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **3. ДАКУМЕНТЫ Л.Я. ПРОКШЫ** | | | | |
| 32 | [Л.Я. Прокша]. "Свинья сбилась с курса…". Неўстаноўлены жанр. Аўтограф | [1950-я - 1970-я гг.] | 4 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 33 | Дароўны надпіс С.М. Сяргеева-Цэнскага Л.Я. Прокшы ад 25.IX.1955 г. на авантытуле свайго рамана "Преображение человека". Друкаване выданне (Сімферопаль, 1955) | | 248 стр. | 1 | |
| | *** | | | | |
| 34 | А. Мендзыжецкий. "Броневский". Артыкул з вершам і фотапартрэтам У. Бранеўскага. Выразка з часопіса | [кан. 1950-х гг.] | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 35 | Фатаграфія Л.Я. Прокшы | [др. пал. 1950-х гг.] | 1 | 1 | |
| 36 | Фатаграфіі Л.Я. Прокшы з вучнямі і інш. | [1930-я гг.] - 1963 | 6 | 6 | |
| 37 | Фатаграфія Л.Я. Прокшы ў групе з П.У. Броўкам і інш. | лета 1941 г. | 1 | 1 | |
| 38 | Фатаграфіі Л.Я. Прокшы ў групах з З.І. Азгурам, Л.П. Александроўскай, І.І. Грамовічам, М. Лыньковым, М. Танкам, Р.Р. Шырмай і інш. у майстэрні З.І. Азгура, падчас выставы, прысвечанай юбілею М. Садавяна, у рэдакцыі газеты "Голас Радзімы" і інш. | [1950-я - 1960-я гг.] - 1983 | 10 | 10 | |
| 39 | Фатаграфіі Л.Я. Прокшы ў групах з іншымі дэлегатамі ад працоўных, вайскоўцаў, моладзі і піянераў для віншавання з 80-годдзем пісьменніка С.М. Сяргеева-Цэнскага (Алушта) | 1955 | 2 | 2 | |
| 40 | Фатаграфія Л.Я. Прокшы з Р.Р. Шырмай і інш. з дароўным надпісам Р.Р. Шырмы Л.Я. Прокшы ад 16.II.1961 г. | | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 41 | Фатаграфіі К.А. Буйло, Г.П. Глебава, Я. Коласа, А.Г. Русака і В.І. Талаша, індывідуальныя. Фатаграфіі К.А. Буйло, У.Ф. Луцэвіч, М. Лынькова і інш. у час неўстаноўленага мерапрыемства і М.А. Машары з сялянамі вёскі Сыцэвічы | [1950-я - 1960-я гг.] коп. за 1942, да 1946 г. | 8 | 8 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Колькасць лістоў | Колькасць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Радашковіцкага раёна.<br>Арыгіналы і копіі | | | | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ К.М. ЯКАЎЧЫКА** | | | | |
| 42 | К. Яковчик (И. Кундиш, Т. Бов) "Литературная Белоруссия", "Молодая белорусская литература".<br>Літаратуразнаўчыя артыкулы.<br>Ксеракопіі газетных публікацый | коп. за 1927-1928 | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 43 | К. Яковчик "В летний день" (1921), "Воля вёсен" (1925). Вершы.<br>Выразка і ксеракопія з газеты | 1926,<br>коп. за 1921 | 2 | 2 | |
| 44 | З. Бядуля "На пороге". Урывак з рамана "Язеп Крушинский", М. Лужанин "Ожидание". Верш.<br>У перакладзе К.М. Якаўчыка (К.М.) з беларускай мовы на рускую.<br>Ксеракопія газетных публікацый | коп.<br>[пасля 1929 г.] | 1 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 45 | Асабістыя дакументы К.М. Якаўчыка (заліковая кніжка Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута ў Маскве з запісамі за 1921-1923 гг., пасведчанне асобы з запісамі за 1925-1933 гг., сяброўскі білет Саюза савецкіх пісьменнікаў "Литфонд" за 1938-1941 гг., даведка аб залічэнні дабраахвотнікам у 2-ю Маскоўскую стралковую дывізію Народнага апалчэння Сталінскага раёна (31.07.1941) і інш.).<br>На Лл. 2, 18 - фатаграфіі К.М. Якаўчыка, індывідуальныя (1921, 1936) | 1923-1941 | 23 | 6 | |
| 46 | Паведамленне аб знікненні без весткі К.М. Якаўчыка ў снежні 1941 года | 1977 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 47 | А. Цыхун "Сын принеманского края". Артыкул.<br>Рэцэнзія Л. Бэндэ на літаратуразнаўчы артыкул К.М. Якаўчыка.<br>Выразка з газеты, ксеракопія аўтографа Л. Бэндэ | 1983,<br>коп. за 1928 | 6 | 2 | |
| 48 | Суправаджальнае пісьмо С.К. Якаўчыка (сына) у БДАМЛМ да дакументаў бацькі (Расія) | 1982 | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 49 | Фатаграфіі К.М. Якаўчыка, індывідуальныя і з | [1930-я гг.], | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | сынам Сяргеем. Арыгінал і копіі | коп. за 1938 | | | |

У дадзены вопіс унесена 49 (сорак дзевяць)

спраў з № 1 па № 49 , 486 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла — заг. аддзела В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў ______________________

______________________

"_____"____________20____ г.